## У Беларусі будзе пашырана крэдытаванне пакупнікоў айчыннай бытавой тэхнікі

**Аб гэтым заявіў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі пасля наведвання ЗАТ «Атлант».**

Кіраўнік урада падкрэсліў, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу перад прадпрыемствам пастаўлена задача прадаваць максімальна магчымы аб'ём прадукцыі, не скарачаючы пры гэтым рынкі збыту. У чэрвені-верасні чакаецца сезонны пік продажаў бытавой тэхнікі «Атлант», і гэты момант нельга прапусціць, лічыць ён.

«Мы ў бліжэйшы час прымем рашэнне аб тым, каб перайсці да пэўнага льготавання пакупніцкіх крэдытаў», — адзначыў прэм'ер-міністр. Такія дзеянні дапамогуць захаваць рынак збыту беларускай бытавой тэхнікі.

Акрамя таго, «мы разлічваем, што рынкі нашых бліжэйшых суседзяў — Расіі, Украіны, Казахстана — не звузяцца», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

**БЕЛТА.**

## КДК Беларусі не выступае за абмежаванне імпарту піва, а вядзе барацьбу з ценявымі схемамі яго рэалізацыі

**Аб гэтым заявіў старшыня КДК Зянон Ломаць на рабочай нарадзе з вядучымі півабарамі рэспублікі, паведамілі ў прэс-службе КДК.**

«Для імпартнага піва ў Беларусі няма ніякіх забарон і перашкод. Камітэт дзяржкантролю не выступае за якія-небудзь абмежаванні яго імпарту. Мы супраць ценявых схем яго рэалізацыі, пры якіх казна недалічваецца мільярдных сум падатковых адлічэнняў», — сказаў кіраўнік галоўнага кантрольнага ведамства краіны.

Камітэтам дзяржкантролю былі раскрыты асобныя схемы ўключэння імпартнага піва ў нелегальны абарот. У адносінах да шэрагу незаконна працуючых структур фінансавай міліцыяй Камітэта дзяржкантролю ўзбуджаны і расследуюцца крымінальныя справы.

На нарадзе было адзначана значнае паляпшэнне работы прадпрыемстваў піўной галіны Беларусі ў апошнія гады. У параўнанні з 2002 годам айчынныя півавары павялічылі вытворчасць піва на 74,4 працэнта. У 2008 годзе беларускія прадпрыемствы выпусцілі 35,4 млн дал піва, пры гэтым 99 працэнтаў прыпадае на долю 7 вядучых вытворцаў: «Крыніцу», «Піўзавод «Аліварыя», «Лідскае піва», «Півавараную кампанію «Сябар», «Брэсцкае піва», «Рэчыцапіва», «Дзвінскі бровар».

У той жа час ёсць і праблемы: не выконваецца праграма развіцця піваварнай галіны на 2006—2010 гады, недастаткова ўвагі ўдзяляецца рэкламе, дызайну, спажывецкай тары. Было ўзнята пытанне аб увядзенні інстытута спецімпарцёра піва. На думку Камітэта дзяржкантролю, гэта мера дасць магчымасць забяспечыць празрыстасць абароту піва.

**БЕЛТА.**

## ХУТКА І ДЗЯДЗЬКА ВАНЯ З ПУХАВІЧАЎ ЗМОЖА ПАБУДАВАЦЬ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У Еўропе сярэдняя цана газу была 450 долараў, у нас — 127,38 долараў. Сёння ў нас 147 долараў, а з 1 ліпеня будзе недзе на ўзроўні 200-205 долараў. Цана ніжэйшая па двух прычынах: таму што транспартны складнік у нас меншы, бо знаходзімся паміж Расіяй і Еўропай, і таму што мы з-за саюзнай дзяржавы газ ужываем без пошліны. Але, — папярэдзіў Уладзімір Сямашка, — гэтае не павінна расслабляць.

Анатоль Русецкі, міністр прамысловасці, асноўную задачу энергаэфектыўнасці і зберажэння бачыць у комплексным падыходзе:

— Сёння няма ніводнага прадпрыемства, якое комплексна, на ўсіх тэхналагічных стадыях, а я кажу пра машынабудаванне, змагло б прымяніць сучасныя тэхналагічныя рашэнні... Сучасныя сістэмы кіравання рэсурсамі дазваляюць скарачаць да 1,5 раза выдаткі на вытворчасці.

Абмеркавалі на пасяджэнні і ўкараненне сучасных святлодыёдных лямпачак. Першы намеснік старшыні прэзідыума НАН акадэмік Пётр Віцязь расказаў, што толькі 5-10 % энергіі лямпачак напальвання ідзе на святло, астатняе — на цяпло:

— Калі зараз перавесці ўсё асвятленне на святлодыёдныя, то гэта дазволіць эканоміць да 30 % энергіі, а гэта вялікія лічбы. Напрыклад, за перыяд 2010—2015 гадоў гэта вылілася б у эканомію электраэнергіі ў аб'ёме 1,1 млрд кілават/гадзін.

Дарэчы, на вытворчасць святлодыёдаў ужо заключана пагадненне з фірмай «Філіпс». Уладзімір Сямашка прызнаўся, што для таго, каб «заманіць» «Філіпс» у Беларусь, ім паабяцалі дзяржзаказ і прапанавалі пачаць з Мінска, а самага багатага горада.

Дарэчы, першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Анатоль Кунцэвіч расказаў, што сёння УП «Мінгарсвятло» эксплуатуе больш за 100 тысяч свяцільнікаў вонкавага асвятлення і што за перыяд з 2000 па 2008 год каля 27 % з іх былі заменены на новыя, больш эканомныя.

Дарэчы, напрыканцы пасяджэння пры абмеркаванні спрэчных пытанняў энергазберажэння Уладзімір Сямашка расказаў пра новыя заканадаўчыя акты, што цяпер рыхтуюцца на Урадзе. Па-першае, паведаміў пра тое, што распрацаваны праект закона аб малой энергетыцы:

— Мы не вынаходзілі беларускі веласіпед, мы па сутнасці перапісалі той закон, які дзейнічае ў скандынаўскіх краінах. Там два асноўных пастулаты. Калі прыходзіць інвестар — замежны ці наш дзядзька Ваня, які ў матрацы ў Пухавічах трымае грошы і не ведае, куды іх укласці, — то мы дазваляем будаваць станцыю, і гэта будзе яго ўласнасць. Як вы ведаеце, пакуль жа ў нас на гэта дзяржманаполія. Дык вось, першы пастулат, што крыніцы энергіі могуць быць прыватнымі, а другі пастулат, што на працягу 7 гадоў існуе льготны рэжым падаткаабкладання, які дазваляе адбіць свае інвестыцыі, — сказаў Уладзімір Сямашка.

Па-другое, першы намеснік прэм'ер-міністра паведаміў, што рыхтуецца ўказ Прэзідэнта, які створыць суперблагу для прыходу інвестара ў Беларусь:

— Калі цяпер мы клічам інвестара, то першае пытанне яны задаюць пра зямлю і ўмовы. І ў гэтым праекце ўказа ўсё агаворана: фактычна мы даём на вельмі льготных умовах зямлю, але адзінае, што будзем патрабаваць, каб максімум за 3 гады на ёй будавалі тое, што абяцалі, каб яна не пуставала і не было махінацый. Наогул, ідэалогія гэтага указа такая, што мы прэферэнцыі даём не на асобныя праекты накшталт Мінск-сіці, а што гэта будзе сістэма.

І нарэшце, Уладзімір Сямашка расказаў, што цяпер абмяркоўваецца указ аб стварэнні венчурных, гэта значыць, рызыковых, фондаў.

Напрыканцы нагадаем, перад экономікай Беларусі на 2009 год пастаўлена задача знізіць энергаёмістасць на 8 %. І Леанід Шэнец, дырэктар дэпартамента па энергафектыўнасці, лічыць, што на сёння выканаць такі паказчык цалкам магчыма. Да таго ж мяркуе, што сёлета рэальна давесці частку мясцовых відаў паліва да 20 % каб наблізіцца да пастаўленай задачы ў 25 % ў 2010 годзе.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Парламенцкі дзённік

# сПАСЕнне ад аПАСЕнняў

**У палітычнай групе «Еўрапейскія дэмакраты» ў ПАСЕ засталіся здаволенымі вынікамі дыскусіі аб перспектывах аднаўлення статусу спецзапрошанага для Беларусі**

Створкі акна ў Еўропу для нашай краіны апошнім часам раскрываюцца шырэй. Узаемныя міжнародныя візіты ды і сам характар перамоў павяваюць цеплынёй. А курс, узяты на ПАСЕ, здаецца фарватарам. Перспектывы аднаўлення статусу спецыяльнага запрошанага для айчыннага парламента ў гэтай структуры абмяркоўваліся нядаўна ў Чэхіі. У перамовах узяў удзел **Анатоль ГЛАЗ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ.** На сустрэчы з журналістамі ён падзяліўся сваімі ўражаннямі ад пасяджэння Палітычнай групы «Еўрапейскія дэмакраты» ў ПАСЕ на тэму «Аднаўленне статусу «спецыяльнага запрошанага» для Беларусі: што ўжо зроблена і што яшчэ трэба зрабіць?».

Паводле слоў палітыка, удзельнікі ўспрынялі перамовы па беларускім пытанні (з удзелам дэпутата і прадстаўнікоў апазіцыі) пазітыўна: яны адзначылі, што задаволены вынікамі дыскусіі і даведаліся вельмі шмат новага. І хоць прамых заяў аб падтрымцы з боку групы не паступала, на думку дэпутата, іншасказальна гэта прагучала менавіта так. Маўляў, інфармацыя будзе абагулена групай, і гэта паслужыць падставай для таго, каб займаць канструктыўную пазіцыю па ўзнаўленні статусу спецыяльнага запрошанага ў ПАСЕ для Беларусі. Верагодна пытанне будзе разгледжана ўжо на наступнай сесіі ПАСЕ, якая адбудзецца ў чэрвені.

Па-ранейшаму своеасаблівай лакмусавай паперкай для еўраструктур застаецца дагэтуль не адмененая ў Беларусі смяротная кара. На думку Анатоля Глаза, «можна прапрацоўваць на заканадаўчай аснове ўвядзенне мараторыю на пакаранне смерцю». Дэпутат нагадаў пра тыя захады, якія робяцца ў краіне ў рамках дамоўленасцяў з еўрапейскімі арганізацыямі, у прыватнасці, работу па ўдасканаленні Выбарчага кодэкса. Пры гэтым ён падкрэсліў, што непрымальныя тыя пазіцыі, якія закранаюць беларускі суверэнітэт і бяспеку, «калі нам будуць дыктаваць, што рабіць». Непрымальным лічыць палітык і правядзенне дэманстрацый, дзе заўгодна. У якасці аргумента ён спаслаўся на вопыт заходнееўрапейскіх краін, у якіх масавыя акцыі праводзяцца ў строга адведзеных месцах. «А тыя пазіцыі, што не наносяць шкоды суверэнітэту, бяспецы і якія ідуць у рамках пашырэння магчымасцяў для нашых грамадзян, яны, вядома ж, могуць быць», — запэўніў спадар Глаз.

Беларусь мела статус спецзапрошанага ў ПАСЕ ў 1992 г., ён быў прыпынены пяццю гадамі пазней. Што азначае яго аднаўленне для краіны цяпер? «Калі будзе прынятае станоўчае рашэнне па статусе спецыяльнага запрошанага для Беларусі ў ПАСЕ, беларуская дэлегацыя атрымае права ўдзельнічаць з правам дарадчага голасу ва ўсіх сесіях асамблеі, у рабоце ўсіх камісій і фарміраванняў», — адзначыў Анатоль Глаз. Ён зрабіў акцэнт на тым, што ўступленне ў Савет Еўропы не з'яўляецца галоўнай мэтай для Беларусі. Аднак удзел у падобных структурах азначае для краіны магчымасць выказваць сваю пазіцыю па міжнародных справах, браць удзел у фарміраванні еўрапейскіх спецыяльных інстытутаў (ці то па супрацьдзеянні гандлю людзьмі, ці то па экалагічных праграмах), дадаткова развіваць экспартны патэнцыял і прыцягваць інвестыцыі. Між тым да Савета Еўропы беларусам хутка будзе рукой падаць — у нашай сталіцы адкрыецца інфармацыйны пункт гэтай еўрапейскай структуры. Афіцыйная цырымонія адкрыцця запланаваная на 8 чэрвеня. Інфапункт, створаны на базе БДУ, будзе папулярызаваць дзейнасць Савета Еўропы, знаёміць з яго задачамі і прыярытэтамі жыхароў краіны.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# НАШ НАЦБАНК НАС БЕРАЖЭ

Члены Савета Рэспублікі ўхвалілі папраўкі ў закон аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі. Паводле змяненняў, у прыватнасці, прадугледжаны новы падыход да падзелу валютных аперацый на бягучыя і капітальнага характару. На пасяджэнні профільнай камісіі — па эканоміцы, бюджэце і фінансах — **Павел КАЛАУР, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка,** звярнуў асаблівую ўвагу сенатараў на норму, паводле якой грамадзяне пры скіраванні сваіх сродкаў за мяжу павінны будуць атрымліваць дазвол Нацбанка. «Калі грамадзянін хоча перавесці свае грошы ў паявыя інвестыцыйныя фонды за мяжу, то Нацыянальны банк разглядае гэтыя хадайніцтвы і яшчэ раз папярэджвае, што тут могуць быць даволі сур'ёзныя праблемы аж да поўнай страты грашовых сродкаў. Таму што ніякіх гарантый ні паявыя фонды, ні тая дзяржава, куды былі пераведзеныя грашовыя сродкі, не даюць. Калі ж грамадзянін, не звяртаючы ўвагі на ўсе нашы перасцярогі, настойвае на тым, каб атрымаць гэты дазвол, мы яго выдаём. Пры гэтым яшчэ раз звяртаем увагу, што Рэспубліка Беларусь адказнасці за страту яго грашовых сродкаў не нясе». Першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка выказаў спадзяванне, што гэта часова — маўляў, фінансавая адукаванасць беларусаў будзе расці, і ад такой нормы можна будзе адмовіцца.

Пасля актыўнай работы непасрэдна профільнай камісіі ніжняй палаты парламента разам з Асацыяцыяй банкаў былі прынятыя і дадатковыя прапановы, — паведаміў спадар Калаур. «У прыватнасці я хацеў бы адзначыць, што пералік негандлёвых аперацый быў дапоўнены. Гэта пераводы, звязаныя з выплатай у патэнтныя ведамствы пошлін і іншых плацяжоў; перавод і атрыманне грашовых сродкаў, звязаных з удзелам у канферэнцыях, семінарах, спартыўных мерапрыемствах, выставах; пераводы, звязаныя са зваротам памылкова ці залішне пералічаных грашовых сродкаў. У цяперашні час яны адносяцца да аперацый, звязаных з рухам капіталу, праводзяцца ў паведамляльным парадку. Аднак сумеснымі намаганнямі мы прыйшлі да высновы, што няма неабходнасці нейкага дадатковага кантролю па гэтых аперацыях, і можна аднесці іх да негандлёвых аперацый». Павел Калаур таксама зрабіў акцэнт на нормах законапраекта, скіраваных на лібералізацыю, якія, чакаецца, будуць успрынятыя суб'ектамі гаспадарання з задавальненнем, бо палегчаць іх жыццё.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

Неасабістае пытанне

# ШЛЮБ ДРУГІ... ДЗІЦЯ ТРЭЦЯЕ

**З першым мужам я ў разводзе, выхоўваю дваіх няпоўнагадовых дзяцей (былы жыве асобна, плаціць аліменты).**

**Цяпер я ў другі раз выйшла замуж, нарадзіла трэцяе дзіця. Ці можна лічыць нашу сям'ю шматдзетнай, і ці маем мы права на атрыманне льготнага крэдыту для паляпшэння жыллёвых умоў (калі я тры гады не змагу працаваць)?**

**А. С.,** ***г. Лунінец***

Згодна з падпунктам 1.3-1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 года № 185 (які вызначае парадак і ўмовы льготнага крэдытавання) пад шматдзетнымі сем'ямі разумеюцца сем'і, якія маюць траіх і больш няпоўнагадовых дзяцей. Да членаў шматдзетнай сям'і адносяцца муж (жонка) і іх дзеці (родныя, усыноўленыя, удачароныя).

У адпаведнасці з артыкулам 62 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (КаШС) шматдзетнай з'яўляецца сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш дзяцей. Статус шматдзетнай сям'і пацвярджаецца пасведчаннем, якое выдаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Згодна з артыкулам 74 КаШС, месцам жыхарства дзіцяці лічыцца месца жыхарства яго бацькоў, альбо (у выпадку асобнага пражывання) вызначанае імі па ўзаемнай згодзе, а ў выпадку яе адсутнасці — судом, зыходзячы з інтарэсаў дзіцяці і з улікам яго пажадання.

У гэтым выпадку двое дзяцей ад першага шлюбу і трэцяе дзіця пражываюць разам з маці і выхоўваюцца ёю, што дае падставу лічыць гэту сям'ю шматдзетнай.

З улікам выкладзенага яна, маючы патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, можа прэтэндаваць на атрыманне ў вызначаным парадку льготнага крэдыту для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання.

Неабходна таксама адзначыць, што ў адпаведнасці з падпунктам 1.11 Указа № 185 шматдзетныя сем'і маюць права на сумеснае выкарыстанне льготнага крэдыту і аднаразовай бязвыплатнай субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў. Ім у вызначаным парадку можа быць выдзелены льготны крэдыт у памеры 95 працэнтаў кошту нарміруемага памеру агульнай плошчы жылога памяшкання, якое будуецца, і аднаразовая бязвыплатная субсідыя ў памеры 5 працэнтаў гэтага кошту.

Пунктам 1.13 Указа № 185 прадугледжана таксама, што шматдзетным сем'ям прадастаўляецца фінансавая дапамога ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах. Пры наяўнасці траіх няпоўнагадовых дзяцей дапамога складае 50 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеным крэдыце.

Што датычыцца плацежаздольнасці сям'і, то яна вызначаецца наступным чынам. Штомесячны плацеж па асноўным доўгу і працэнтах за карыстанне крэдытам не павінен перавышаць 50 працэнтаў сукупнага даходу ў сям'і крэдытаатрымальніка. Пры гэтым у разлік могуць быць прыняты і даходы паручыцеляў.

**Віктар САВІЦКІ.**

# АЛЕГА ЯНКОЎСКАГА Ў БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ ПАМЯТАЦЬ ЯК ФРАНЦЫСКА СКАРЫНУ

Напачатку 70-х гадоў фільм «Я, Францыск Скарына» рэжысёра Барыса Сцяпанава выйшаў на экраны і скарыў гледачоў магутнасцю вобразу асветніка і першадрукара, у чым была безумоўная заслуга акцёра, які выканаў гэтую ролю. Магчыма таму, што шляхетнасць у яго — у крыві. Польская шляхетнасць — так кажуць прадстаўнікі акцёрскай дынастыі Янкоўскіх, якая, зрэшты шмат зрабіла для культуры Беларусі. Алега Янкоўскага любілі не толькі таму, што ён меў дачыненне да прац «Беларусьфільма», але за тое, што сапраўды вылучаўся шляхетнасцю, высакароднасцю, нават нейкай вытанчанай рамантычнасцю сярод артыстаў Савецкага Саюза.

Алег Іванавіч Янкоўскі быў узнагароджаны пяць гадоў таму падчас кінафестывалю «Лістапад» прызам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За гуманізм і духоўнасць у кіно» найперш за народную любоў, а не толькі за дачыненне да беларускага кіно, кінастудыі «Беларусьфільм» і беларускай зямлі, дзе яго цудоўна прымалі. Кароткае жыццё ў Мінску, у старэйшага брата Расціслава магло застацца ў яго душы ўспамінам пра першыя крокі на сцэне — падлеткам ён іграў хлопчыка на сцэне Рускага драматычнага тэатра імя Горкага. Зрэшты, пра акцёрства тады зусім не думаў. Гэта той выпадак, калі лёс сам знайшоў героя. І цяпер ужо разумееш, што дакладная і бліскучая ігра Алега Янкоўскага зрабіла сваю справу ў фільмах «Люстра» і «Настальгія» Андрэя Таркоўскага. І разумееш, што ў Марка Захарава не магло быць іншага Джанатана Свіфта ці барона Мюнхаўзена... А чым вам Алег Янкоўскі не «Стыляга» — хоць у адным з апошніх фільмаў з яго ўдзелам (які, дарэчы, Валерый Тадароўскі здымаў у Мінску) акцёр іграў строгага тату-дыпламата, але ж было зразумела, наколькі яго акцёрскі і чалавечы стыль бездакорны.

Жыў высакародна, іграў высакародных. Высакародна ён і сышоў. Ужо калі ведаў, што моцна хворы, імкнуўся ўсё роўна не парываць сувязі з тэатрам і выходзіў на сцэну, пакуль мог іграць. Пражытыя 65 гадоў пакінулі цудоўныя ролі і выдатныя ўспаміны пра народнага артыста СССР Алега Янкоўскага.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю Алега Янкоўскага



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным, блізкім і калегам народнага артыста Савецкага Саюза Алега Янкоўскага ў сувязі з яго смерцю.

«Алег Янкоўскі навечна ўвайшоў у гісторыю як легендарны майстар тэатра і кіно, чалавек выдатнага таленту і шырокай душы, чыя дзейнасць пакінула яркі след у савецкім, рускім і сусветным мастацтве, — гаворыцца ў спачуванні. — Для нашай краіны Алег Іванавіч заўсёды быў блізкім, родным чалавекам, які ўнёс значны ўклад у развіццё нацыянальнага кінематографа і ўмацаванне культурных сувязяў брацкіх народаў. Яго смерць стала незаменнай стратай для ўсіх беларусаў».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Продаж білетаў на футбольны матч Беларусь — Андора пачнецца 21 мая ў Мінску і Гродне

**Білеты на адборачны матч чэмпіянату свету па футболе — 2010 паміж зборнымі Беларусі і Андоры паступяць у продаж 21 мая. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» (АБФФ).**

Плануецца, што з заўтрашняга дня білеты можна будзе купіць у касах сталічнага стадыёна «Дынама» і ЦСК «Нёман» у Гродне. Цана білетаў — ад Br10 тыс. да Br40 тыс.

Маючую адбыцца сустрэчу ў Гродне будзе абслугоўваць судзейская брыгада са Славеніі на чале з Робертам Крайнчам. Інспектарам матчу назначаны Уладзімір Антонаў (Малдова), а камісарам Ары Шыло (Ізраіль).

Цяпер у 6-й адборачнай групе чэмпіянату свету — 2010 сітуацыя такая: Англія — 15 ачкоў, Харватыя — 10, Украіна — 7, Беларусь — 6, Казахстан — 3, Андора — 0. Украінцы і беларусы правялі па 4 гульні, а астатнія каманды згулялі на матч больш. Акрамя сустрэчы ў Гродне 6 чэрвеня ў гэтай групе адбудуцца яшчэ два паядынкі: Харватыя — Украіна і Казахстан — Англія.

**БЕЛТА.**

## Беларусь ў пяцёрцы асноўных гандлёвых партнёраў Расіі

Беларусь па выніках першага квартала бягучага года замацавалася ў пяцёрцы асноўных гандлёвых партнёраў Расіі. Сярод краін СНД Беларусь упэўнена займае першае месца па аб'ёму тавараабароту з Расіяй. Доля Беларусі ў знешнім гандлі Расіі ў студзені-сакавіку склала 5,3 працэнта. Па выніках 2008 года гэты паказчык быў 4,7 працэнта.

## Абзац

◢ **Аператыўнасць беларускіх і літоўскіх пагранічнікаў выратавала жыццё трактарысту ў Ашмянскім раёне. Увечары 19 мая мясцовыя літоўскія жыхары на мяжы Беларусі і Літвы каля вёскі Вялікія Мядзенінкі знайшлі ў меліярацыйным канале, які адначасова праходзіць па лініі мяжы, перакулены трактар з прычэпам. У трактары знаходзіўся заціснуты чалавек — работнік прыгранічнага беларускага СПК. Трактар збіраў камні з палёў пасля пасяўной, але кіроўца не справіўся з кіраваннем і з'ехаў у канаву. З беларускага боку прыбылі падраздзяленні МНС, ДАІ і хуткай дапамогі. На працягу 25 мінут пацярпелага выцягнулі з трактара. Давялося выкарыстаць гідраўлічныя нажніцы і іншыя спецпрыстасаванні.**

◢ Ілжэсацыяльныя работнікі скралі грошы ў пенсіянеркі ў Барысаве. У міліцыю звярнулася 81-гадовая жанчына і заявіла, што дзве невядомыя жанчыны, назваўшыся сацработнікамі, скралі з яе кватэры $680, Br1 млн 580 тыс. Узбуджана крымінальная справа.

◢ **У Салігорску затрыманы мясцовы жыхар, які падазраецца ў забойстве школьніка. Труп 16-гадовага вучня 9-га класа быў выяўлены на беразе вадасховішча ў Салігорску. Па заключэнні экспертызы, падлетка задушылі. Супрацоўнікі праваахоўных органаў выявілі, што школьніка пасля спрэчкі задушыў раней судзімы мясцовы жыхар, 1982 г.н. Вядзецца следства.**

◢ Ласяня трапіла ў бяду на тэрыторыі прадпрыемства «Рэчыцадрэў». Лясны жыхар, які невядома як трапіў на тэрыторыю завода, апынуўся ў катлаване глыбінёй 3 м. Спробы рабочых самастойна падняць жывёліну на паверхню не прынеслі поспеху. Выратавальныя работы правялі супрацоўнікі раённай службы МНС.

## Поўны абзац

◢ **Суд прызнаў дацкую тэлежурналістку вінаватай у жорсткім абыходжанні з жывёламі: ствараючы перадачу, яна выліла ў акварыум шампунь ад перхаці. Гэтым яна хацела прадэманстраваць высокі ўзровень таксічных рэчываў у мыйным сродку. Інцыдэнт адбыўся ў рамках перадачы аб правах спажыўца. Праз тры дні былі мёртвыя ўсе гупі, акрамя адной. Суд згадзіўся з тым, што журналістка здзейсніла заведамую жорсткасць у дачыненні да жывёлаў і парушыла закон аб іх абароне.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***


## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**23 июня 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион по продаже объектов, находящихся в государственной собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона**

**На аукционные торги выставляются:**

| Предмет аукциона, местоположение недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей.<br>Сумма задатка для участия в аукционе, рублей | Характеристика недвижимого имущества | Информация о земельном участке.<br>Условия использования земельного участка |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1**<br>Здание гаражей (инв. № 614/С-18230), расположенное по адресу: Минская область, г. Смолевичи, ул. Ленинская, 1, находящееся в собственности Смолевичского района | 50 536 335<br>(в том числе: недвижимое имущество – 47 493 455, право аренды земельного участка – 3 042 880)<br>сумма задатка – 5 000 000 | Здание одноэтажное. Фундамент бетонный, стены – блоки, облицованные кирпичом, перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы бетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Общая площадь – 176,5 кв.м. Год постройки – 1979 | Срок аренды земельного участка – 99 лет.<br>Площадь – 0,0222 га.<br>Земельный участок отведен для обслуживания и эксплуатации здания |
| **Продавец:** Коммунальное унитарное предприятие «Смолевичский районный комбинат бытового обслуживания», расположенное по адресу: Минская область, г. Смолевичи, ул. Трудовая, 18, тел. (01776) 55 6 67.<br>**Арендодатель земельного участка:** Смолевичский районный исполнительный комитет | | | |
| **Лот № 2**<br>Незавершенное законсервированное капитальное строение (инв. № 612/U-5842), расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, ул. Брестская, 19, находящееся в собственности города Жодино | 280 970 458<br>(в том числе: недвижимое имущество – 256 463 748, право аренды земельного участка – 24 506 710)<br>сумма задатка – 25 000 000 | Строение одноэтажное, в том числе производственный корпус № 1, производственный корпус № 2. Фундамент столбч., монолитн., сборный ж/бетон, стены и перегородки – ж/бетонные колонны, керамзитобетонные панели, перекрытие сборное ж/бетонное, крыша рулонная.Степень готовности – 23 %. Общая площадь – 2902,5 кв.м. Строительство приостановлено в 1994 году | Срок аренды земельного участка – 30 лет.<br>Площадь – 0,9422 га.<br>Разрешено в установленном порядке изменение назначения объекта и использование земельного участка для обслуживания и эксплуатации здания |
| **Продавец:** Жодинское городское унитарное предприятие «Объединение жилищно-коммунального хозяйства», расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, ул. Лебедевского, 16, тел.: (01775) 7 03 01, 7 03 02.<br>**Арендодатель земельного участка:** Жодинский городской исполнительный комитет | | | |

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в аукционе, соглашение о правах и обязанностях сторон, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия рай(гор)исполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.
2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.
3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.
4. После заключения с рай(гор)исполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок.
5. Получить в установленном порядке разрешение рай(гор)исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до объявления его проданным.

**Сумма задатка** перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу:
**г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел.: 224 39 76, 500 47 10.**
Последний день подачи заявок **19 июня 2009 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников 23 июня 2009 г. с 10 до 10.50.**
К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.
Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Минского облисполкома: www. minsk-region. gov. by


## Эканамічны форум у Гомелі

**Сёння ў Гомелі пачаў работу міжнародны эканамічны форум, заяўкі на ўдзел у якім падалі каля трохсот прадстаўнікоў з фірмаў і арганізацый з 22 краін (самая далёкая з іх — Сінгапур).**

Як паведаміла нам старшыня камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Эльвіра Карніцкая, адрозненне яго ад усіх пяці інвестыцыйных форумаў, якія праводзіліся ў вобласці ў папярэднія гады, у тым, што ён, акрамя інвестыцыйнай накіраванасці, будзе мець яшчэ і знешнеэканамічна-гандлёвы напрамак і развіццё малога бізнэсу. І яшчэ: як ніколі раней, вялікую зацікаўленасць да форуму праявілі расійскія і ўкраінскія рэгіёны, якія знаходзяцца далёка ад Гомеля. Наогул жа з заяўленых трохсот прадстаўнікоў фірмаў больш як дзвесце з'яўляюцца замежнымі.

Аблвыканкам выдаў каталог, які змяшчае звыш ста інвестыцыйных прапаноў прадпрыемстваў і арганізацый, продаж маёмасці і зямельных участкаў пад інвестыцыйныя праекты. Акцэнт зроблены таксама і на развіццё турызму ў вобласці. Свае паслугі ў гэтым і іншых напрамках прапаноўвае і шэраг раёнаў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

**Калектыў «Звязды» выказвае шчырыя спачуванні свайму аўтару, паэту Леаніду Дранько-Майсюку з выпадку напаткаўшага яго вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

# УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У КОНКУРСЕ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Гэта звязана з тым, што ў многіх сельскіх населеных пунктах зачыняюцца малакамплектныя агульнаадукацыйныя школы, і навучэнцы, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, вымушаны наведваць установы адукацыі, размешчаныя ў іншых населеных пунктах, у тым ліку ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, — патлумачыў Аляксандр Жук. — Таму прафесійна зарыентаваны абітурыент, які па аб'ектыўных прычынах заканчваў гарадскую школу, вымушаны быў канкурыраваць пры паступленні з гарадскімі жыхарамі, якія выбіраюць сельскагаспадарчыя спецыяльнасці пераважна з-за нізкага прахаднога бала.

А пасля заканчэння сельскагаспадарчай ВНУ яны, як правіла, не замацоўваюцца ў вёсцы: адпрацуюць належныя два гады па размеркаванні і пераязджаюць у горад. Пры паступленні ж на ўсе астатнія спецыяльнасці ў асобным «сельскім конкурсе» змогуць удзельнічаць абітурыенты, якія не толькі пражываюць у сельскай мясцовасці не менш як два гады на момант атрымання адукацыі, але і закончылі ўстановы адукацыі, размешчаныя ў сельскай мясцовасці.

У «абноўленых» Правілах прыёму пашырыўся пералік асобаў, якія маюць права на льготы пры паступленні ў ВНУ. Так, пераможцы і прызёры Юнацкіх Алімпійскіх гульняў пры паступленні на спецыяльнасці фізічнай культуры і спорту <u>**будуць залічвацца без уступных іспытаў.**</u> Асобы, якія праходзяць службу ў органах пагранічнай службы (прапаршчыкі і сяржанты, якія праходзяць службу па кантракце, вайскоўцы тэрміновай службы, якія праслужылі не менш чым адзін год, звольненыя з тэрміновай ваеннай службы ў запас у год прыёму), якія маюць рэкамендацыі воінскіх часцей, будуць залічвацца <u>**па-за конкурсам**</u> у ВНУ Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў у інтарэсах органаў пагранічнай службы ў межах 30 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму. А выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія маюць стаж працы па спецыяльнасці не менш як два гады, пры паступленні на завочную форму атрымання адукацыі па адпаведнай або роднаснай спецыяльнасці будуць карыстацца <u>**пераважным правам на залічэнне**</u> пры роўнай колькасці набраных балаў.

Яшчэ адно важнае новаўвядзенне датычыцца адмены ніжняй мяжы тэставага бала. З гэтага года ўсім абітурыентам, якія атрымаюць на цэнтралізаваным тэсціраванні адзін бал і больш, будзе дадзена магчымасць удзельнічаць у конкурсе. Гэта рашэнне прымалася з улікам таго, што абітурыенты паступаюць з сертыфікатамі цэнтралізаванага тэсціравання не толькі ў ВНУ, але і ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Таксама прымалася пад увагу і тая акалічнасць, што некаторым ВНУ і ССНУ з-за іх спецыфікі было праблематычна ажыццяўляць набор прафесійна зарыентаваных на пэўную спецыяльнасць абітурыентаў з высокімі баламі ЦТ (маюцца на ўвазе, у першую чаргу, сельскагаспадарчыя, а таксама ваенныя спецыяльнасці). А адмена ніжняй мяжы тэставага бала, як лічаць у Міністэрстве адукацыі, дазволіць ім адабраць «сваіх» абітурыентаў, якія не толькі закончаць навучальную ўстанову, але і будуць працаваць па абранай спецыяльнасці. Вось толькі ёсць апасенні, якімі журналісты падзяліліся з намеснікам міністра, што пры адсутнасці конкурсу на мэтавыя месцы (адзін прэтэндэнт на месца) на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці ў ВНУ могуць трапіць абітурыенты з вельмі нізкімі баламі ў сертыфікатах.

— Будзем давяраць школьным атэстатам, у якіх адзнакі па прадметах уступных іспытаў павінны быць у прэтэндэнтаў на мэтавую падрыхтоўку не ніжэй як 5 балаў, — рэзюмаваў Аляксандр Жук. — Да таго ж ЦТ — гэта рэйтынгавая форма кантролю ведаў. Мы не выяўляем абсалютныя веды, а толькі параўноўваем абітурыентаў паміж сабой. Адна справа, калі ты не дапушчаны да ўдзелу ў конкурсе, і зусім іншая — калі ты ўдзельнічаў у конкурсе, але ў цябе не хапіла набраных балаў. Мяркуем, што гэта новаўвядзенне спадабаецца і абітурыентам, і іх бацькам. Паглядзім, што ў нас атрымаецца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




## «Погиб поэт...»

Гэта ўжо як правіла: збіраюцца за сталом людзі адной прафесіі і адразу ж дамаўляюцца: аб працы — ні слова!

І зноў жа гэта як правіла: дзейнічае дамова не даўжэй, як да трэцяй чаркі. Пасля — гавораць менавіта пра яе, любімую-нелюбімую працу — спачатку ўсур'ёз, а потым і да кур'ёзаў даходзіць.

Прынамсі, гэту гісторыю мы з мужам пачулі ў Жыткавіцкім раёне ад свайго ж калегі-настаўніка. Прычым расказваў ён не пра некага з вучняў, а пра сябе ж. Гучала ўсё прыкладна так.

Бацька наш быў звычайным вяскоўцам, калгаснікам, але вельмі хацеў, каб мы, ягоныя сыны (усе пяцёра) вывучыліся, атрымалі вышэйшую адукацыю, сталі сапраўднымі людзьмі. Аднак хацець падобнага — мала, трэба і нешта рабіць. Бацька выхоўваў нас асабістым прыкладам, строгім словам, а яшчэ — рэгулярна хадзіў да ручаіны, што працякала непадалёк ад хаты, наразаў там доўжанькіх галінак лазы, ставіў у вядро з вадой. Навошта? Можна, відаць, не тлумачыць: калі нехта з нас нешта адчыбучваў, бацька загадваў самому ж зняць портачкі, легчы на лаву...

Гэта было вельмі сорамна! Гэта было вельмі балюча: браты расказвалі, мяне на той час Бог мілаваў. А тут...

Аднойчы ў школе нам задалі вывучыць верш Лермантава «Смерць паэта». Дома я адразу ж сеў за ўрокі, за кніжку. А на вуліцы якраз выпаў снег, дзеці ва ўсю ганялі на санках, ляпілі бабу. Я не вытрываў і панёсся да іх. Нагойсаўся, натаміўся і таму, вярнуўшыся ў хату, рашыў хоць на мінутку прылегчы. Мама пашкадавала мяне будзіць, вось я і праспаў да раніцы. Але вершык вучыў — па дарозе ў школу, на перапынках... Марна.

І вось пачынаецца ўрок. Галіна Іванаўна выклікае ахвотных. На маё гора іх зусім няшмат, таму ў хуткасці гучыць страшнае:

— Расказваць верш пойдзе... Гайкевіч.

Ледзь перастаўляючы свае ватныя ногі я паслухмяна рушыў да дошкі. Пачаў:

***Погиб поэт! — невольник чести —***
***Пал, оклеветанный молвой...***

Болей я вывучыць не паспеў, а галоўнае — уявіў, як жа нізка — на лаўку — «упаду» я, як буду ляжаць, і як бацька...

Ад адной думкі пра тое, што будзе далей, я горка, гучна заплакаў.

Настаўніца падышла да мяне, прыабняла за плечы, прытуліла да сябе і ціха-ціха сказала:

— Хлопчык мой, якое ж чулае ў цябе сэрца, якая тонкая, ранімая душа... Успрымаць чужы боль, як свой, — на гэта здольны не кожны... Сядай, калі ласка, пяць.

Агаломшаны гэтымі словамі, гэтай адзнакай, я сеў. Галіна Іванаўна больш нікога не выклікала — пачала тлумачыць новую тэму. Мне было вельмі сорамна.

...На працягу астатніх школьных гадоў я часта ўспамінаў гэты выпадак, але праўду настаўніцы сказаў толькі на выпускным.

...Я таксама выкладала ў школе рускую літаратуру, і калі задавала вучням вывучыць верш «Смерць паэта», часта расказвала дзецям гэту гісторыю. Яны моцна смяяліся, а пасля, як мне здаецца, думалі — хто пра геніяльных рускіх паэтаў, хто пра хлопчыка з такой тонкай, ранімай душой.

**Іна Аляксееўна Гананайка,**
*г. Ляхавічы*

## Галоўнае — напалохаць

У калектыве круты характар галоўнага эканаміста добра ведалі ўсе — паважалі, а найбольш — пабойваліся. Прычым не толькі падначаленыя, але і кіраўніцтва. Прынамсі, заходзіць яна неяк у кабінет да дырэктара і ледзь не з парога кажа:

— Калі вы не выдзеліце мне пазыку, я не ведаю, што з сабою зраблю!

Падумаў дырэктар: чым чорт не жартуе, калі Бог спіць? Яшчэ і праўда зробіць... Выдзелілі ёй крэдыт.

Колькі там часу прайшло, зноў яна на прыёме, зноў уся ў слязах і зноў з ультыматумам:

— Калі вы не выдзеліце мне матэрыяльную дапамогу, я не ведаю, што з сабою зраблю!

— Пабойцеся Бога! — папрасіў дырэктар і... сам жа ў чарговы раз пабаяўся. У выніку — выдзелілі жанчыне грашовую дапамогу...

У трэці раз яна, расказвалі, нядаўна да кіраўніцтва хадзіла. І зноўку з просьбай:

— Калі вы не дасцё мне пуцёўку ў санаторый, я не ведаю...

Старшыня прафкама ў гэты дзень у гуморы быў, не пабаяўся, запытаў у яе:

— Ну і што ж вы, каханенькая-родненькая, можаце тады зрабіць?

— Ды сама не ведаю, — разгубілася кабета. — Напэўна, у вёску, да мамы паеду.

**Кастусь Карнялюк,**
*г. Віцебск*

## Век жыві, век вучыся!

У нейкай з газет нядаўна вычытаў, што калі падчас любошчаў болей жарсці ў мужчыны, у сям'і народзіцца хлопчык, калі ў жанчыны — дзяўчо. Во думаю, знайшлі сякеру пад лаўкай: я даўно гэта ведаю. Больш за тое...

Было гэта на пачатку 80-х. Я тады пры пасадзе быў, меў службовую машыну, і кіраваў ёй малады мужчына — Віктар. Але па імені яго не зваў ніхто: мянушка была — Пятак. Мо таму, што рыжаваты, круглатвары і дужа ж гаваркі, усмешлівы: ні адна паездка з ім не абыходзілася без нейкіх прыгод, без нейкіх размоў.

І вось — чарговая.

У яго тады (усе чыста пра гэта ведалі) жонка ў раддоме ляжала.

Віктар зганяў да яе раніцой, потым яшчэ раз, увечары. Назаўтра — зноў. Я нічога супраць не меў, бо дзеці ж у сям'і не так часта з'яўляюцца...

І вось пасля абеду ўлятае той Пятак у дыспетчарскую і ва ўсё горла крычыць:

— Ур-ра! Мужыкі! У мяне мацак нарадзіўся! (Таму, хто не ведае, патлумачу: мацак — гэта не проста хлопчык, а здаровенькі, моцны... — **Аўт.**). Ур-ра!.. Стаўлю ўсім па бутэльцы! — працягвае шчаслівы бацька, — а Раманавічу (гэта значыць, мне) — нават дзве.

— Ты што, Пятак, — насцярожыўся ў адказ галоўны інжынер гаспадаркі, — у падхалімы запісаўся, ці што: Раманавіч начальнік, дык яму ўжо і дзве... Чаму гэта?

— Дык гэта ж ён, Раманавіч, дапамог мне... Ну, мацака зрабіць!

— Як гэта? — зашумелі мужыкі. — Ты што — сам не справіўся б?

— Не! Далібожачкі. У мяне б зноў дзеўка атрымалася... Усё ён, Раманавіч! Праўду кажу!

Усе паглядалі на мяне. Пятак жа, анічога не заўважаючы, нёс сваё — расказваў, як аднойчы, падчас паездкі, гаварылі мы пра дзяцей, як пазайздросціў ён на тое, што ў мяне два сыны, як сказаў, што таксама хацеў бы, ды баіцца, што яшчэ адна дзеўка будзе, як я яму выклаў сваю тэорыю (праверану практыкай), як ён ёй скарыстаўся... Дзевяць месяцаў назад...

Карацей, хоць далёка не адразу, але Віктар давёў такі, што ўся мая дапамога ў гэтай далікатнай справе зводзілася да мудрай парады. І нікольні не больш.

А вы што падумалі?

**Л.Р. Кароткін,**
*в. Вярэнькі, Пастаўскі раён*

## Без віны

Пра таго высокага міліцэйскага начальніка баек многа хадзіла, бо ён, як многія каратышы, хварэў на манію вялікасці і, здаралася, дзіка лютаваў. А ўжо калі і падставы на гэта меў...

То аднойчы, неспадзеўкі, яго, досыць галоднага, прынесла ў наша мястэчка. Абед якраз быў, таму «наведванне аб'ектаў» ён пачаў з рэстарана — заказаў там штосьці на першае, штосьці на другое.

Кліентаў у зале няшмат было, заказ досыць хутка прынеслі. Ён нават лыжку ўжо ўзяў... І тут у сваёй талерцы ўбачыў... муху — вялікую, жывую.

— Што гэта?! — закрычаў на ўсю залу.

— Салдацік, даражэнькі, ну ці ж ты мухі ніколі не бачыў? — вінавата спытала ў яго пажылая афіцыянтка. — Ці ж варта з-за яе так нервы паліць?..

— Кнігу скаргаў мне! — яшчэ гучней зароў абражаны («салдаціка» знайшлі!). І як гахне кулачком па стале.

Гэтыя не ўласцівыя зале гукі, разнесліся па ўсіх кутках рэстарана. У тым ліку — да кабінета дырэктара. Ён, ну вельмі спалоханы, хуценька падбег да стала, глянуў у талерку, сказаў: «Во, цыбулька... Смажаная...», двума пальцамі вылавіў яе і... з'еў — чаго нервавацца?

А наведвальнік, між тым, ужо і... «перастаў» — закрыўшы рот сваёй пяцярнёю, ён куляй выскачыў з рэстарана.

Ніякіх доказаў, ніякіх улік у яго не было, а значыць, і скаргі таксама?

**А. Ліпень,**
*Іўеўскі раён*

## Слава... неслухам!

Кажуць, што жыццё паласатае. У той год у нашай сям'і паласа была светлая: атрымалі нарэшце ордэр на новую двухпакаёвую кватэру, пераехалі, больш-менш абставіліся: у нас (гэтым цяпер нікога не здзівіш) нават тэлевізар другі з'явіўся.

Паставіць яго рашылі на кухні, выбралі месца — засталося антэну правесці.

Муж, дзякаваць Богу, не бязрукі ў мяне — усё падрыхтаваў, усё прамераў і неяк вечарам узяўся за дрыль. Дзірку стаў круціць над плінтусам, у зале. Спачатку (я чула гэта па гуку), свярдзёлак ішоў вельмі цяжка — ведама, у бетон, затым — як у пустое... Але пры гэтым нідзе ў кухні ён... не выйшаў.

Муж нічога не зразумеў, рашыў, што няўдала, відаць, выбраў месца. Пачаў яшчэ раз: сантыметраў на пяць вышэй і правей.

Вынік быў акурат такі ж.

На гук і на раду знізу прыйшоў больш сталы і дасведчаны сусед. Цяпер ужо ён узяў у рукі дрыль, мы ўсёй сям'ёй у чаканні прыселі на кухні — вылупіўшы вочы глядзелі на плінтус. Марна!

Назаўтра муж паехаў да знаёмага будаўніка, стаў распытваць, што б гэта значыла? Той паціснуў плячыма, сказаў, што свярдзёлак, па-першае, мог пайсці ў падлогу (чатыры разы?), а па-другое — куды менш верагоднае — будаўнікі маглі замест адной пліты-перагародкі паставіць дзве, з пустатой паміж — для гукаізаляцыі. Карацей, трэба глядзець на месцы.

Назаўтра, пасля працы, той спецыяліст ужо быў у нас. Прычым, не адзін — з дзіцячага садка забраў малога. Менавіта яго (нас дома яшчэ не было) мужыкі пасадзілі на кухні, сказалі глядзець на сцяну, і як толькі над плінтусам нешта пакажацца, гучна закрычаць.

Малы паслухмяна сеў на кукішкі, мужыкі (утрох — муж, сусед і майстар) узяліся за справу. Прасвідравалі дзірку адзін раз, усунулі туды досыць доўгі кусок арматурыны — міма, «у малако», потым яшчэ раз (пакурыўшы, памазгаваўшы, некаму пазваніўшы) і яшчэ...

Толькі пасля гэтага малы на кухні закрычаў:

— Татка, сюды!.. Ёсць!

Шчаслівыя мужыкі куляй уляцелі на кухню. Малы (во неслух!) роўненька стаяў на табурэтцы і пазіраў на вуліцу — у акно...

Але пры гэтым ім, тром мужыкам, паказваў на... знаёмы кавалак арматурыны, што тырчаў са сцяны.

Толькі тут да мужчын дайшло, што дом, так бы мовіць, няроўны, што зала ў ім адносна кухні метра на паўтара выступае.

Удосталь нарагатаўшыся і на радасцях пацiскаўшы малога, мужыкі ў чарговы раз прасвідравалі дзірку — правялі антэну...

А той кавалак арматурыны тырчыць са сцяны і сёння. Пакінулі... На ўспамін. Пра светлую паласу жыцця.

**Людміла В.**
*г. Мінск*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# БУДАЎНІЦТВА — АНТЫКРЫЗІСНАЯ ЗБРОЯ

У Клімавіцкім раёне захоўваецца стабільная сітуацыя, але гэта не значыць, што эканамічны крызіс не адчуваецца на ўсходнім памежжы Беларусі.

Па-першае, знізілася пакупніцкая здольнасць насельніцтва: людзі штодня ходзяць у крамы, але, паводле падлікаў, набываюць на трацiну менш.

Дабрабыт людзей залежыць і ад запазычанасцяў: кажуць, што сума выдадзеных крэдытаў на аднаго жыхара Клімавіцкага раёна дастаткова высокая. Людзям, як ніколі, вельмі патрэбныя стабільная праца і варты заробак.

Каб паспяхова выкараскацца з крызісных з'яваў, у Клімавічах робяць стаўку на будаўніцтва.

— Традыцыйна вядома, што адзін будаўнік цягне за сабой яшчэ 7 рабочых розных спецыяльнасцяў, — каментуе старшыня Клімавіцкага райвыканкама Віталь Грышанаў. — Гэта не мы прыдумалі, і насамрэч гэта так. Таму сёння трэба актыўна развіваць будаўнічую галіну.

У Клімавічах у апошнія гады добра развіваецца будаўніцтва жылля. Пасля працяглай паўзы, у 2005 годзе, у раённым цэнтры здалі 40-кватэрны дом. І гэта стала пачаткам новай жыллёва-будаўнічай эры.

У сувязі з павелічэннем нараджальнасці чарга на жыллё павялічылася да 800 чалавек. У новых кватэрах маюць патрэбу 46 шматдзетных сем'яў.

— За грошы, якія паступілі ў раённы бюджэт ад прыватызацыі жылля — а гэта больш за 250 мільёнаў рублёў, мы замовілі дакументацыю на новы дом, — паведаміў Віталь Грышанаў. — У другім паўгоддзі пачнём будаўніцтва 25-кватэрнага дома для тых людзей, якія стаяць на сацыяльнай чарзе.

Два дамы — на 60 і 80 кватэр — цяпер будуюцца ў раённым цэнтры. Плануецца пачаць узвядзенне яшчэ двух. Гэта ўсё кааператыўнае жыллё.



Калі выбухнуў крызіс, настала імгненная паўза. Але цяпер зноў актыўна фарміруюцца новыя жыллёва-будаўнічыя кааператывы. Сёлета ўдалося стварыць ужо тры кааператывы. Таму ў Клімавічах лічаць, што сёлетняе заданне ў 15 тысяч квадратных метраў будзе выканана.



— Сёння ў Клімавічах ёсць рэальная магчымасць наладзіць жыццё для маладой сям'і, — лічыць кіраўнік раёна. — Спецыяліста забяспечым працай, а праз кааператыў можна і праз паўгода атрымаць ключы ад новай кватэры.

Менавіта такую схему ўлады Клімавічаў лічаць рэальнай магчымасцю прывязаць людзей да малога горада.

— Клімавічы — гэта дастаткова цікавы горад, — пераконвае Віталь Грышанаў. — Цяпер на Клімавіцкім лікёра-гарэлачным заводзе, які з'яўляецца самым буйным падаткаплацельшчыкам у вобласці, сярэдні заробак перавышае мільён рублёў. Грошы вартыя, а выдаткі на жыццё ў райцэнтры будуць меншыя, чым у абласным цэнтры ці сталіцы. Жыллё чалавеку пабудуем. А што яшчэ трэба? Каб быў свой кут і хлеб. Ну, хіба толькі відовішчаў не стае. Працуем над гэтым: напрыканцы мая ў нас распачынаецца міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка».

Але ў аснове жыцця чалавека — усё ж не святы, а будзённыя справы і праблемы. Людзям зараз проста неабходны новыя працоўныя месцы. Гэта звязана з вяртаннем мужчын з Расіі. З Клімавіцкага раёна сотні людзей накіроўваліся на заробкі за блізкую мяжу. Цяпер служба занятасці раёна часам за тыдзень прымае да ста чалавек.

Сёння, падлічваюць улады, палова ад агульнай колькасці нашых працаўнікоў вярнулася з Расіі: у суседняй краіне яшчэ больш востра перажываюць крызіс — так кажуць тыя, хто вяртаецца на радзіму. Палова яшчэ трымаецца ў Расіі, але іх сем'і атрымліваюць ад іх стольк і грошай, колькі можна зарабіць дома ў мясцовай будаўнічай арганізацыі.

Клімавічам зараз вельмі патрэбны будаўнікі, і тут кажуць, што мужчыны, якія папрацавалі на будоўлях у Расіі, прайшлі, як бы там ні было, добрую школу. Яны больш не ўспрымаюць павольны часам рытм працы на айчынных будаўнічых пляцоўках. Гэтыя працаўнікі не прызвычаіліся сядзець, і яны не будуць чакаць гадзінамі, пакуль падвязуць раствор альбо адрамантуюць кран.

Будаўнікі хочуць прадаць сваю працу і атрымаць грошы, а раённыя ўлады хочуць актыўнай будаўнічай кампаніяй пазмагацца з крызісам.

— Я зычу ўсім працаваць, захоўваць спакой і глядзець у будучыню з аптымізмам, — звяртаецца да жыхароў Клімавіцкага раёна Віталь Грышанаў.

**Ілона ІВАНОВА.**
*г. Клімавічы.*

## УКРАЛІ ЛІТАРЫ ДЗЯЎЧАТКІ

Вучаніца 9-га класа адной са школ горада Веткі і навучэнка Гомельскага педагагічнага каледжа абвінавачваюцца ў крадзяжы пяці пластыкавых літар са стэлы-паказальніка сельгаспрадпрыемства «Іскра-Ветка» каля вёскі Прысна Веткаўскага раёна. Яшчэ ў лютым была ўзбуджана крымінальная справа і пасля правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў стала вядома, што дзве сяброўкі на добрым падпітку выкралі 20-сантыметровыя літары, прынеслі іх у дом знаёмай і там пакінулі. Кошт літар, між іншым, складае 800 тысяч рублёў.

Начальнік АУС Веткаўскага райвыканкама Анатоль Хмелянок адзначыў: «У разуменні звычайных людзей можа гэта і свавольства. Але гэта парушэнне закона, якое цягне крымінальную адказнасць».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Погляд

# НА КАГО БУДЗЕМ СПАДЗЯВАЦЦА ЗАЎТРА?

*У салуне на Дзікім Захадзе:*
*«Не страляйце ў піяніста — ён іграе як можа».*

**Пісаць пра конкурс «Еўрабачанне-2009» не збіраўся, бо для мяне ўсё было ясна яшчэ задоўга да паўфіналу, але, пазнаёміўшыся з прэсай, якая падвяла вынікі і пракаментавала конкурс, вырашыў усё ж выказаць свой погляд, бо галоўнае, на маю думку, згубілася ў разборцы эпізодаў конкурсу, эмоцыях...**

Чаму перамог Рыбак, а не Елфімаў? І гэта пры тым, што голас у апошняга больш моцны.

Я не ведаю нарвежскай мовы, як і англійскай, і не мог сказаць, пра што спявалі выканаўцы, але быў упэўнены, што Рыбак спяваў пра нешта добрае — перад гледачамі быў жывы чалавек. А хто зразумеў, чаго «рваў душу і горла» Елфімаў? І ўжо ў гэтым ён абсалютна прайграў Рыбаку. Я не кажу пра пастаноўку — другі план. Пеця спяваў як мог — ён стараўся, і прайграў не Елфімаў, а тыя, хто зрабілі на яго стаўку.

Свет рухаецца, і людзей на сёння падкупіла натуральнасць, а надуманае ў мастацтве, прыцягнутае «за вушы», не ўспрымаецца ці з'яўляецца часовым.

Дазволю сабе невялікае адступленне. Калі нашы спартсмены выступаюць у чырвона-зялёнай форме — колерах дзяржаўнага сцяга, то гэта ўспрымаецца натуральна. А вось калі на сцэну выходзяць спявачкі ў народных строях, дзе гарсэты і спадніцы зялёныя, то гэта фальшыўка. Зялёны колер у беларускім народным адзенні адсутнічае цалкам.

І так ва ўсім — за справу павінны брацца прафесіяналы.

Тут і паўстае наступнае пытанне: а ці трапіў бы Саша Рыбак на «Еўрабачанне», калі б яго выбіралі ў нас?

Працэс адбору кандыдата на еўрапейскі конкурс паказаў, што народ, галоўны суддзя ў тым адборы, у значнай меры быў пазбаўлены магчымасці прагаласаваць. А інакш чаму людзі не маглі дазваніцца на студыю і аддаць свой голас? Спасылка на абмежаваныя магчымасці тэлефоннай сувязі смешная. Збіраемся ў космас, а не маем тэхнікі, каб зафіксаваць званкі тэлегледачоў? У гэта цяжка паверыць. Хутчэй за ўсё, людзі нічога не вырашалі ў тым адборы. Проста была зроблена стаўка на Елфімава, і гэтага было дастаткова.

**«Які ўжо конкурс запар нашы спевакі выконваюць песні на англійскай мове. Чаго да яе прывязаліся? Большасць выканаўцаў спявалі на роднай мове і душэўна. Неабходна пазбаўляцца ад комплексу непаўнавартасці.»**

Уявім, што на тым беларускім адборачным конкурсе адным з канкурэнтаў Елфімава быў Рыбак. Хто выйшаў бы пераможцам? Гледачы прагаласаваць у поўнай меры не маглі б, а так Рыбак здаваўся б праставатым правінцыялам — ім пастаянна патрэбны нейкія выкрутасы і кандэбоберы на замежны лад. Вось і запрасілі польскага пастаноўшчыка, хоць ёсць прыклад: у фінал трапіла спявачка з Мальты без усякіх пастановак і прытанцовак, выйшла да мікрафона — і ў фінале.

***Некалькі слоў наконт мовы.***

Які ўжо конкурс запар нашы спевакі выконваюць песні на англійскай мове. Чаго да яе прывязаліся? Большасць выканаўцаў спявалі на роднай мове і душэўна. Неабходна пазбаўляцца ад комплексу непаўнавартасці.

Але абвінавачваць Елфімава будзе несправядліва.

Вось А. Ціхановіч увесь час падкрэсліваў, што выступленне нашага спевака ў паўфінале было надзвычай моцным, і ён нават зрабіў спасылку на SMS Ф. Кіркорава: «100% пройдзеце! Малайцы!!!» А хіба ў папсы не свае гульні? Філіп Бядросавіч сказаў адно, а ў галаве, магчыма, трымаў другое. Вядома ж, Ціхановічу застаецца толькі скардзіцца, што не хапіла ўдачы. А магчыма, сам Ціхановіч узяўся не за сваю справу. Быць некалі вядомым спеваком — гэта адно, а кіраўніком праекта — зусім іншае. Тут патрэбны іншы талент...

Усё ўзаемазвязана! І тое, як паводзілі сябе каментатары, асвятляючы «Еўрабачанне-2009», напэўна ж, не выпадкова. Мінулагоднія асвятленні конкурсаў выклікалі крытычныя заўвагі, але справа не даходзіла да адкрытага... Анекдот пра малдаван, іх галовы і салёныя таматы, які падкінуў тэлегледачам адзін з каментатараў — сведчанне культурнага ўзроўню гэтых супрацоўнікаў тэлебачання. А пачуўшы, што калі б «Еўрабачанне» праводзілася тры разы на год, то яны і англійскую мову вывучылі б, захацелася спытаць: «Хлопцы, калі вы па-англійску ні слова, то што вы нам некалькі гадзін баялі — конкурс жа вёўся на мове, якой вы не ведаеце?»

Праблема завязана на недахопе культуры: бытавой, нацыянальнай, сусветнай. Усе яны важныя, але калі ў чалавека адсутнічае пачуццё нацыянальнай годнасці, то ён быццам авечка, якая адбілася ад атары — торкаецца туды-сюды, не ведае куды прыстаць.

Нешта падобнае (і не ўпершыню) адбываецца ў нас з конкурсам «Еўрабачанне». На мой погляд, складваецца ўражанне, што арганізатары не ведаюць, чаго хочуць. Раней спадзяваліся на расіяніна Кіркорава, сёлета — на паляка Юзэфовіча, а заўтра на каго?

Можа, час вызначыцца і стаць на свае ногі?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

**23 июня 2009 г. проводит аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков под строительство объектов придорожного сервиса**

| № лота | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель | Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Срок аренды, лет | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Гомельская область, Гомельский р-н, Терюхский с/с, автомобильная дорога М8/Е95 граница РФ (Езерище) – Витебск – Гомель – граница Украины (Новая Гута) км 455,3 – км 456,3 У1 Кадастровый номер: 321087600018000063 Арендодатель – Гомельский районный исполнительный комитет | Участок лесных земель, ограничения в использовании 0,2443 га в связи с их расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Сож | 0,2443 | 49 | Строительство магазина с мини-кафе, модуль-блоков сервисного обслуживания | - снятие, сохранение плодородного слоя почвы и использование его для благоустройства территории; - возмещение Гомельскому райисполкому расходов по подготовке материалов аукциона в сумме 567 000 руб. | 1 206 440 | 120 000 |
| 2. | Гомельская область, Ельский р-н, вблизи пограничного пункта таможенного оформления «Новая Рудня» Кадастровый номер: 321400000001000270 Арендодатель – Ельский районный исполнительный комитет | Участок лесных земель, подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети, ограничений в использовании по охранным зонам нет | 0,1535 | 50 | Строительство модуль-блоков сервисного обслуживания и междугородней связи | - снятие плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 81 440 | 8 000 |
| 3. | Гомельская область, Ельский р-н, вблизи пограничного пункта таможенного оформления и на территории пограничного пункта таможенного оформления «Новая Рудня» Кадастровый номер: 321400000001000271 Арендодатель – Ельский районный исполнительный комитет | 0,1772 га – участок лесных земель, 0,1547 га – участок технологической подъездной автодороги к локальным очистным сооружениям дождевых стоков, ограничений в использовании по охранным зонам нет | 0,3319 | 50 | Строительство стоянки автотранспорта на 30 машин | - снятие плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 176 090 | 15 000 |
| 4. | Гомельская область, Ельский р-н, вблизи пограничного пункта таможенного оформления «Новая Рудня» Кадастровый номер: 321400000001000272 Арендодатель – Ельский районный исполнительный комитет | Участок лесных земель, подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети, ограничений в использовании по охранным зонам нет | 0,5206 | 50 | Строительство гостиницы на 15-20 мест | - снятие плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 276 200 | 25 000 |
| 5. | Гомельская область, Ельский р-н, вблизи пограничного пункта таможенного оформления «Новая Рудня» Кадастровый номер: 321400000001000273 Арендодатель – Ельский районный исполнительный комитет | Участок лесных земель, подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети, ограничений в использовании по охранным зонам нет | 0,4931 | 50 | Строительство кафе на 25-30 мест | - снятие плодородного слоя почвы и использование для благоустройства территории | 261 610 | 25 000 |

1. Аукцион состоится **23 июня 2009 г. в 11.30** в здании фонда «Гомельоблимущество» по адресу: г. Гомель, пр. Ленина, 3.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление установленной формы в фонд «Гомельоблимущество». Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также: юридические лица – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельство о государственной регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на русский (белорусский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом. При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предъявляют паспорт.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 9.00 до 17.00**, последний день приема документов **19 июня 2009 г.** до 16.00 по адресу: **г. Гомель, пр. Ленина, 3,** каб. 406. Заключительная регистрация участников – 23 июня 2009 г. с 9.00 до 11.15. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на счет № 3642927330048 в филиале № 300 Гомельского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомеля, МФО 151501661. Получатель – фонд «Гомельоблимущество», УНП 400243904.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона согласно счетам-фактурам; внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.

7. Возможность ознакомления с предметом аукциона обеспечивают арендодатели в срок до 19 июня 2009 года.

8. Организатор открытых торгов вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона.

9. Телефоны организатора аукциона для справок: 8 (0232) 70 14 72, 74 90 27 фонд «Гомельоблимущество», сайт www.gomel-region.by и сайт www.gomelinvest.gov.by

## КАЛІ ЁСЦЬ ТРАКТАР

**З тэрыторыі, на якой вядзецца будоўля, нехта выкраў 10 м³ газасілікатных блокаў, больш за тысячу штук цэглы, 30 м.кв. матэрыялу для даху... Пра гэта ў Брэсцкае РАУС паведаміў галоўны інжынер будаўнічага ўпраўлення ААТ.**

Каб вывезці такую колькасць матэрыялу, патрэбен быў транспарт, і ён знайшоўся ў трактарыста ААТ. Так што доўга шукаць злодзея не давялося.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ПАД ДУЛАМ ЗАПАЛЬНІЦЫ,

якая была падобная на пісталет, апынуліся сярод белага дня дзве жанчыны — прадаўшчыца і пакупніца крамы ў вёсцы Выношаўка Кармянскага раёна. Сюды з нядобрымі намерамі завітаў 40-гадовы гамяльчанін і стаў патрабаваць грошы. Жанчыны кінуліся ў дапаможнае памяшканне і выклікалі міліцыю. Злодзей тым часам знайшоў невялікую суму грошай, прызначаную для выдачы рэшты і выбег на вуліцу. Мільён рублёў, які захоўваўся пад замком, застаўся некранутым. Кіраўнік Кармянскага РАУС Сяргей Лялькоў аддаў распараджэнні аператыўна-следчай групе, і разам з першым намеснікам Русланам Максіменкам яны адразу выехалі на месца злачынства. А па дарозе пабачылі мужчыну, які ішоў праз поле да Кармы. Міліцыянеры па прыкметах пазналі злачынцу і адразу яго затрымалі. Пры асабістым аглядзе былі знойдзены выкрадзеныя 15 тысяч рублёў і той самы пісталет-запальніца, сапраўды, вельмі падобная на зброю. Наперадзе следства і суд — для неаднаразова судзімага грамадзяніна пакаранне будзе больш суровым: ад 6 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МИНСКСОРТСЕМОВОЩ»**

**БУДЕТ ПРОИЗВОДИТЬ ВЫПЛАТУ ДИВИДЕНДОВ В ТЕЧЕНИЕ МЕСЯЦА, НАЧИНАЯ С 2 ИЮНЯ 2009 г. С 8 ДО 17 ЧАСОВ (КРОМЕ СУББОТЫ И ВОСКРЕСЕНЬЯ) ПО АДРЕСУ: г. МИНСК, ул. МИНИНА, 21, КОРП. 1.**

Акционерам, не работающим в ОАО «МинскСортСемОвощ», дивиденды будут перечислены на лицевые счета в АСБ «Беларусбанк» по месту обмена чеков «Имущество» на акции.

УНН 600052664.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже *складской базы* (имеется ж/д ветка), в составе: административные здания, об. пл. 105,1 кв.м; 66,1 кв.м; здание склада № 1, 1025,7 кв.м; здание склада № 2, 985,5 кв.м; здание склада № 3, 581,6 кв.м; гараж металлический (6х12); канализационная площадка; крановая эстакада; противопожарный водоем; склад цемента (250 т); территория базы (песчано-гравийное покрытие); асфальтированная площадка (2321 кв.м); забор ж/б (352 м.п.), расположенной по адресу: *Минский район, г. Заславль, ул. Привокзальная, 2.* Начальная цена с НДС – 1 370 000 000 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформировано три земельных участка – 0,1084 га; 0,5319 га; 0,5854 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.02.2009 г. Аукцион состоится **05.06.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.06.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон: (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

**Утерянные представительством № 3 по г. Минску Белгосстраха бланки страховых полисов:**

— обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии АЖ с № 3784545 по № 3784554;

— квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) форма 1 СУ серии ГС с № 8569042 по № 8569055;

— квитанция о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам форма 1 СУо серии КО с № 0420399 по № 0420410 считать недействительными.

УНП 101883943

